**Малько, Т.** [Сяргей Уладзіміравіч Хоміч] / Т. Малько // Родныя вытокі. — 2007. — 12 мая. — С. 2.



Напярэдадні свята Перамогі начальнік міліцы падпалкоўнік Уладзімір Ходаль і яго намеснік падполкоўнік Алег Лубачка ад Міністэрства Унутраных спраў уручылі юбілейныя медалі «90 год міліцыі Беларусі» сваім былым супрацоўнікам у Крулеўшчыне. Для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і міліцыі Міхаіла Ануфрыевіча Цішаловіча і Аляксея Аляксеевіча Таляронка і ветэрана міліцыі Сяргея Уладзіміравіча Хоміча гэта ўзнагарода вельмі важная, бо з'яўляецца сімвалічным адлюстраваннем іх працы, якой яны аддалі не адзін год свайго жыцця.

– Адразу пасля службы ў Афганістане я прыйшоў працаваць у транспартную міліцыю на ст. Крулеўшчына, – адзначыў С. У. Хоміч. – Работа была не самая лёгкая. Часта прыходзілася ўставаць сярод ночы, ехаць за дзесяткі кіламетраў для расследавання злачынстваў, якія адбыліся на транспарце. І так на працягу васемнаццаці год. Я ганаруся тым, што з'яўляюся ўладальнікам такой узнагароды.

Служба гэтых людзей адзначылася на дзяржаўным узроўні. А гэта дарагога каштуе.

**Т. Малько**

**На здымку:** для ветэрана міліцыі і былога воіна-інтэрнацыяналіста С. У. Хоміча ўзнагарода – вялікая пашана і гонар